# ХЛЕБ — УСЯМУ ГАЛАВА

## НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ПОМНІКІ



**Па гарызанталі: 2.** Хлеб — усяму ... (прык.). **6.** Рух наперад, развіццё. **8.** ... — хлеба дзяжа (прык.); ... — адна з народных назваў свята Прачыстай, Успення (28 жніўня). **9.** Булачны выраб у выглядзе кольца; радзімай ... лічыцца г. Смаргонь, а помнік яму усталяваны ў г. Стамбуле (Турцыя). **12.** Цыбуля з часнаком — родныя ... (прык.); помнік цыбулі знаходзіцца ў Венгрыі, а часнаку — у ЗША (штат Мічыган). **13.** Абласны горад у Расіі, дзе ўстаноўлены помнік перніку. **14.** Горная парода. **15.** Хлеб — над панамі ... (прык.). **16.** Невялікі кій. **17.** «Беларускай бульбе слава \\ Ходзіць шумна з краю ў ... , \\ Бульбе помнік мы паставім». З верша В. Голуба «Бульба»; помнікі бульбы стаяць у Швецыі, Румыніі, Польшчы, Германіі, Расіі. **18.** ... на спіне, дык і хлеб на стале (прык.). **20.** Горад на Брэстчыне, дзе ў 2014 годзе быў устаноўлены помнік беларускаму хлебу, а ў г. Лідзе ёсць помнік хлебу ў выглядзе снапа. **22.** Сей жыта ў прысак, а ... у гразь, то будзеш князь (прык.). **24.** Абшар, далягляд. **25.** Харчовы прадукт з прэснага цеста ў выглядзе трубачак; помнік ... знаходзіцца ў сталіцы Францыі. **26.** На пустым месцы і ... не расце (прык.). **27.** Усё станоўчае, карыснае. **28.** Блін з дзёртай бульбы, які з'яўляецца амаль брэндам Беларусі; помнік ... знаходзіцца ў г. Корасцень (Украіна).

**Па вертыкалі: 1.** ... — хлебу падмога (прык.). **3.** Запал, моцнае захапленне. **4.** Жаночае імя. **5.** Вараны піражок, начынены тварагом, ягадамі; помнікам ... могуць пахваліцца жыхары гарадоў Сургут і Ейск (Расія), Чаркасы (Украіна). **7.** Трэці, ... Спас; назва хлебнага, арэхавага Спаса, які адзначалі 29 жніўня. **8.** Тое, што і адхон. **10.** Глыбокая павага. **11.** Горад на Міншчыне, дзе знаходзіцца помнік курынаму яйку. **17.** У каго родзе ..., у таго і каўбаса тлуста (прык.); помнікі гэтай агароднінe ўсталяваны ў Томску і Ніжнім Ноўгарадзе (Расія). **19.** Плод агароднай культуры, помнік якому ўпрыгожвае адзін з куточкаў г. Шклова. **21.** ... з возу — каню лягчэй (прык.). **22.** Дэталь хадавога механізма гадзінніка. **23.** Тое, што і танцы (разм.). **24.** Яблыкі, грушы і іншыя плады, якія апалі ад ветру; помнікі яблыку ёсць у гарадах: Курску (Расія), Алматы (Казахстан) і Іерусаліме (Ізраіль), помнік грушам існуе ў Аўстраліі (г. Канбера), а ў г. Кіеве ёсць фантан «Груша».

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі: 2.** Галава. **6.** Удым. **8.** Спажа. **9.** Абаранак. **12.** Браты. **13.** Тула. **14.** Скарн. **15.** Пан. **16.** Кіёк. **17.** Край. **18.** Пот. **20.** Пінск. **22.** Авёс. **24.** Абсяг. **25.** Макарона. **26.** Трава. **27.** Дабро. **28.** Дранік.

**Па вертыкалі: 1.** Бульба. **3.** Азарт. **4.** Ванда. **5.** Варэнік. **7.** Малы. **8.** Скос. **10.** Шанаванне. **11.** Салігорск. **17.** Капуста. **19.** Агурок. **21.** Кума. **22.** Анкер. **23.** Скокі. **24.** Апад.

## Даты Падзеі Людзі

### 25 ЖНІЎНЯ

**1891** год — на Сусветнай электратэхнічнай выставе ў Франкфурце-на-Майне ўпершыню ў свеце рускім электратэхнікам Міхаілам Даліво-Дабравольскім была прадэманстравана сістэма перадачы электрычнай энергіі на далёкую адлегласць па пераменным трохфазным току.

**1901** год — нарадзіўся Васіль Трафімавіч Варанянскі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнік грамадзянскай вайны, баёў у раёне возера Хасан у 1938-м. У верасні 1941 года арганізаваў і ўзначаліў партызанскую групу, якая вырасла ў партызанскі атрад. З лютага 1942-га — камандзір партызанскага атрада «Мсцівец», затым — партызанскай брыгады «Народныя мсціўцы», якая дзейнічала на тэрыторыі Мінскай вобласці. Загінуў падчас пералёту праз лінію фронту ў 1943 г. Яго імем названы вуліцы ў Мінску і г.п. Плешчаніцы.

**1906** год — каля трох гадзін дня адбыўся замах на старшыню Савета міністраў Расіі Пятра Сталыпіна на яго службовай дачы на Аптэкарскім востраве ў Пецярбургу. Тры пераапранутыя баевікі-эсэры ўвайшлі ў памяшканне, карыстаючыся сваёй маскіроўкай (двое былі ў форме жандармаў), але тут былі выкрытыя адным з ахоўнікаў. Убачыўшы небяспеку, баевікі ўзарвалі бомбы, якія знаходзіліся ў партфелях. Акрамя іх саміх, загінулі яшчэ 29 чалавек, большая частка дачы была разбурана, але Сталыпін застаўся цэлы. Смяротная атака на яго была напярэдзе.

**1930** год — з Архангельска на Зямлю Франца-Іосіфа і Новую Зямлю на ледакольным параходзе «Георгій Сядоў» выйшла першая савецкая высокашыротная экспедыцыя па даследаванні Карскага мора пад кіраўніцтвам О. Шміта і В. Візэ. Экспедыцыя ўпершыню даследавала паўночную частку Карскага мора, быў адкрыты шэраг астравоў, архіпелаг Сядова (на захад ад Паўночнай Зямлі). На востраве Дамашні палярнікі пабудавалі новую палярную станцыю. На працягу двух гадоў чатыры зімоўшчыкі на чале з Г. Ушаковым вялі даследаванні Паўночнай Зямлі. «Георгій Сядоў» дайшоў амаль да 81 градуса паўночнай шыраты, але далейшы шлях быў закрыты, і судна павярнула на поўдзень. 14 верасня параход паспяхова вярнуўся ў Архангельск. Працерабіўшы шлях у 10 000 км, экспедыцыя выканала грандыёзную праграму комплексных навуковых назіранняў. Праз тры гады на аснове прац групы Г. Ушакова была складзена поўная карта Паўночнай Зямлі.



**1991** год — Вярхоўны Савет БССР прыняў пакет рашэнняў аб палітычнай незалежнасці і эканамічнай самастойнасці Беларусі; аб дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады і кіраўніцтва.

### Было сказана

**Еўдакія ЛОСЬ, паэтка:**
*«Калі роўныя тры дубочкі, то каторы з іх лепшы?»*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.07 | 20.13 | 14.06 |
| Віцебск — | 5.54 | 20.06 | 14.12 |
| Магілёў — | 5.58 | 20.04 | 14.06 |
| Гомель — | 5.58 | 19.57 | 13.59 |
| Гродна — | 6.23 | 20.28 | 14.05 |
| Брэст — | 6.27 | 20.25 | 13.58 |

### Месяц

***Апошняя квадра 06.41. Месяц у сузор'і Блізнят.***

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандра, Аляксея, Антона, Аркадзя, Вячаслава, Дзмітрыя, Пятра, Сяргея.*
***К.*** *Луізы, Людовіка, Рыгора, Юзафа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Студэнт у дэканаце пытаецца дэкана:
— Я не здаў трэцюю пераздачу, што мне цяпер рабіць?
Дэкан:
— Зараз вам трэба прайсці медкамісію.

**Аб'ява ў службе знаёмстваў.**
**«Малады чалавек шукае жанчыну, сябра, суразмоўцу і палюбоўніцу ў адной асобе. Калі прыйдуць усе чацвёра — буду толькі рады».**

На ганку інтэрната сядзіць сумны кот. Аб'ява на ўваходных дзвярах:
«Пераканаўчая просьба — не пускаць ката ў інтэрнат! У нас ужо 10 цяжарных кошак!
Адміністрацыя».

**Галоўны сакрэт ежы.**
**Ноччу ежа смачнейшая. Заўсёды.**

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3310.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 24 жніўня 2016 года.